Працуем па новых падручніках

***Антановіч Н. М.**, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.**, начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Працяг. Пачатак гл. № 9–11 за 2022 г.*

### Урок* 47. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэты ўрока:*** пазнаёміць з асаблівасцямі вымаўлення слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі і перадачай іх на пісьме; фарміраваць першапачатковыя ўменні правапісу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі, уменне тлумачыць напісанне слоў з апорай на схему; фарміраваць уменне пісаць пад дыктоўку словы з падоўжанымі зычнымі гукамі; пазнаёміць са слоўнікавым словам *песня*; развіваць фанематычны слых, звязнае вуснае маўленне, мысленне; адпрацоўваць вымаўленчыя навыкі; выхоўваць цікавасць да беларускіх народных свят.

***Абсталяванне:*** карткі з літарамі ***н***, ***я***, ***с***, ***е***, ***п***; мяч; фотаздымкі са святкавання Каляд.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 20.***

Адзін вучань услых чытае загадку і называе адгадку. Затым вучні па ланцужку называюць словы, якімі дапаўнялі загадку, і праверачныя да іх словы. *(Снег — снегу, лёд — лядок, мёд — мядок.)* Варта падабраць праверачнае слова і да слова-адгадкі. *(Мядзведзь — мядзведзі.)* Узор тлумачэння: «Вымаўляю слова — [с’н’эх]. На канцы слова ёсць зычны, парны па звонкасці-глухасці. Змяняю слова так, каб пасля парнага зычнага стаяў галосны — ***снегу***. У слове *снег* на канцы слова пішу ***г***».

Праверка дамашняга задання завяршаецца паўтарэннем правіла праверкі зычных, парных па звонкасці-глухасці на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад зычнымі.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік чытае праблемную сітуацыю на с. 18 у вучэбным дапаможніку, вылучаючы голасам падоўжаныя зычныя гукі ў словах *жыццё, наваколле, узлессе, раздолле, задавальненне, захапленне*.

— У якіх словах дзядуля вымаўляў некаторыя зычныя гукі падоўжана? Назавіце гукі, якія гучалі падоўжана. *([ц̄’], [л̄’], [н̄’], [с̄’].)*

Настаўнік яшчэ раз дэманструе ўзор вымаўлення слоў, вучні ўслед за ім вымаўляюць словы хорам. Настаўнік запісвае словы на дошцы.

— Якімі літарамі перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў у словах? *(Літарамі **цц**, **лл**, **нн**, **сс**.)*

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік прапануе вучням самастойна сфармуляваць тэму і мэты ўрока.

***Практыкаванне 21.***

Вучні парамі называюць прадметы, адлюстраваныя на малюнках. *(Колас — калоссе, камень — каменне, галіна — галлё.)* Настаўнік просіць вызначыць і назваць словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Калі вучні вымаўляюць словы з падоўжанымі зычнымі гукамі няправільна, настаўнік абавязкова паказвае ўзор правільнага вымаўлення. Вучні называюць літары, якімі на пісьме перадаюцца падоўжаныя зычныя гукі, і літары, паміж якімі яны пішуцца (з апорай на схемы). Запіс слоў арганізуецца на дошцы з каменціраваннем.

Пасля выканання пісьмовага задання настаўнік прапануе вучням зрабіць вывад і адказаць на пытанні:

— Якія гукі могуць вымаўляцца ў беларускай мове падоўжана? Паміж якімі гукамі яны знаходзяцца ў слове — зычнымі ці галоснымі?

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 19). Затым вучні яшчэ раз чытаюць інфармацыю самастойна.

— Пра што новае вы даведаліся з рубрыкі? Якія яшчэ зычныя гукі, акрамя тых, што вы ўжо называлі, могуць вымаўляцца падоўжана паміж галоснымі? Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў? На які падоўжаны гук варта звярнуць асаблівую ўвагу? Чаму?

***Практыкаванне 22.***

Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка разглядаюць і абмяркоўваюць схему з практыкавання. Настаўнік звяртае ўвагу на першы этап у схеме — правільнае

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.

вымаўленне слова. Затым вучні выконваюць пісьмовае заданне на дошцы і ў сшытках. Важна, каб дзеці прагаворвалі ўслых дзеянні, якія выконваюць для вызначэння правільнага напісання слоў. *(Бервяно, бярвенне, цішыня, зацішша, стагоддзе.)*

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік прапануе вучням скласці новае слоўнікавае слова з літар, «рассыпаных» на дошцы:

Н Я С Е П

Настаўнік цікавіцца, ці любяць вучні спяваць (слухаць) песні; якія народныя песні ведаюць.

— Вымавіце слова *песня*. Падзяліце яго на склады. *(*[п'э-с'н'а]*.)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На першы склад —* [п'э]*.)* Назавіце гукі па парадку. *(*[п'], [э], [с'], [н'], [а]*.)* Колькі мяккіх зычных гукаў у слове? Якія? *(*[п'], [с'], [н']*.)*

Настаўнік прапануе вучням знайсці слова *песня* на форзацы вучэбнага дапаможніка, прачытаць яго так, як яно запісана. Акцэнтуецца ўвага вучняў на малюнак, зроблены на літарах ***сн***. Настаўнік тлумачыць, што літару ***ь*** пасля ***с*** не пішам, нягледзячы на тое, што вымаўляем гук [с'].

Вучні запісваюць у сшытак слова *песня*, ставяць націск, падкрэсліваюць літары ***сн***. Настаўнік прапануе вучням адказаць на пытанне: «На якія святы вы спяваеце песні?» Адзін сказ на выбар можна запісаць.

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 23.***

Настаўнік можа дадаткова падабраць розныя фотаздымкі са святкавання Каляд, арганізаваць іх разглядванне і абмеркаванне.

Адзін вучань чытае верш услых, астатнія сочаць. Затым вучні пералічваюць стравы, што прыгадваюцца ў вершы (куцця, бліны); называюць страву, адлюстраваную на малюнку ў вучэбным дапаможніку.

Настаўнік цікавіцца, ці ўсе вучні каштавалі куццю; пры неабходнасці дае дадаткова тлумачэнне: куцця — гэта каша з ячных або іншых круп, якую звычайна гатавалі на Каляды, перад Новым годам.

Значэнне слова *ладныя* вучні ўдакладняюць у тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка.

Затым вучні хорам вымаўляюць выдзеленыя словы, вызначаюць словы з падоўжанымі зычнымі гукамі, тлумачаць, якімі літарамі іх трэба абазначыць на пісьме. *(Куцці, у жыцці.)* Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што падоўжаныя зычныя гукі вымаўляюцца паміж галоснымі. Кожны вучань самастойна спісвае першы сказ і падкрэслівае ў словах літары, якімі на пісьме перадаюцца падоўжаныя зычныя гукі. Арганізуецца ўзаемаправерка выкананага задання.

***Практыкаванне 24.***

Перад чытаннем тэксту вучні разглядаюць малюнак і выказваюць свае меркаванні адносна таго, пра што ў ім будзе расказвацца. Вучні чытаюць тэкст, расказваюць, як людзі калядуюць; знаходзяць у тэксце сказ, якім можна падпісаць малюнак.

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі арганізуецца франтальна. Узор тлумачэння вучня: «Вымаўляю слова — [с'в'аткаван'э]. У слове падоўжаны гук [н']. На пісьме яго трэба перадаць дзвюма літарамі — ***нн***».

Вучні запісваюць пад дыктоўку настаўніка словы *калядаванне, святкаванне, з'яўленне, пажаданні, жыццё, гаданне*. Перад гэтым пажадана прыгадаць алгарытм запісу пад дыктоўку. Пасля запісу слоў кожны вучань самастойна падкрэслівае літары, якімі на пісьме перадаюцца падоўжаныя зычныя гукі, а таксама запісвае слоўнікавае слова *пé-сня*.

Настаўнік цікавіцца, ці ведаюць вучні калядныя песні, ці могуць іх праспяваць.

***Гульнявое заданне «"Зладві" словы з падоўжанымі зычнымі гукамі».***

Настаўнік называе словы і кідае мяч вучню. Вучань вымаўляе слова, калі ў ім ёсць падоўжаны зычны гук, называе гэты гук і вяртае мяч настаўніку. Калі падоўжанага гука ў слове няма, вучань моўчкі вяртае мяч настаўніку.

Лексічны матэрыял для задання: ноччу, ноч, чытанне, вяселле, весяліць, падарожжа, годзік, стагоддзе, узбярэжжа, узвышша, вышыня, вулей, вуллі, сучча, жыццё, жыць, мазь, маззю.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 21–22, практ. 25. Вучні вызначаюць, што ў вершы два сказы; знаходзяць значэнне слова *карункі* ў канцы вучэбнага дапаможніка. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што верш трэба запісаць у слупок, правільна афармляючы кожны сказ.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якія зычныя гукі могуць вымаўляцца падоўжана ў беларускай мове? Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў? Якімі літарамі перадаецца падоўжаны гук [дз']?

## Урок 48. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэты ўрока:*** фарміраваць навык правапісу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі; пазнаёміць з правілам пераносу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі; развіваць уменне тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы; узбагачаць слоўнікавы запас фразеалагізмамі; фарміраваць уменне вусна пераказваць тэкст; развіваць фанематычны слых, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да чытання.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 25.***

Вучань выразна чытае верш услых, называе «мастака», пра якога ў ім расказваецца. Настаўнік прапануе вучням падабраць і назваць праверачнае слова да слова *мароз. (Мароз — маразы.)*

Вучні чытаюць словы, у якія ўстаўлялі прапушчаныя літары, вылучаюць слова з падоўжаным зычным гукам. *(Дыханнем.)*

— Назавіце зычныя гукі, якія ў беларускай мове могуць вымаўляцца падоўжана. Паміж якімі гукамі — зычнымі ці галоснымі — яны вымаўляюцца падоўжана? Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў? Якімі літарамі на пісьме перадаецца падоўжаны гук [дз']?

**3. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік паведамляе вучням, што яны працягваюць вывучаць тэму «Падоўжаныя зычныя гукі.

Іх абазначэнне на пісьме»; прапануе вучням самастойна сфармуляваць мэты ўрока, пры неабходнасці ўдакладняе.

**4. Этап замацавання.**

***Практыкаванне 26.***

Вучні вызначаюць зашыфраваныя словы, вымаўляюць іх і па ланцужку запісваюць на дошцы. *(Наваколле, раздолле, стагоддзе, разводдзе, падарожжа, узбярэжжа, багацце, пачуццё, купанне, насенне.)*

Варта звярнуць увагу на значэнне слова *разводдзе* — веснавая вада, вясенні разліў. Трэба ўдакладніць, ці разумеюць вучні значэнне іншых слоў, якія запісалі.

Завяршаецца выкананне практыкавання выказваннямі вучняў пра магчымыя варыянты падзелу слоў для пераносу, прыгадваюцца ўжо вядомыя ім правілы падзелу слоў для пераносу. Каб пераканацца ў правільнасці/няправільнасці сваіх меркаванняў, настаўнік прапануе звярнуцца да рубрыкі «Важная інфармацыя» на с. 22 вучэбнага дапаможніка і ўдакладніць, якія ёсць варыянты падзелу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі для пераносу.

***Практыкаванне 27.***

Настаўнік чытае верш, высвятляе, значэнне якіх слоў вучні не ведаюць. Неабходна растлумачыць, што легенда — гэта народнае паданне аб якой-небудзь гістарычнай падзеі, асобе, якое выдаецца і ўспрымаецца як верагоднае; паданне — гэта вуснае апавяданне, якое жыве ў народзе, перадаецца з пакалення ў пакаленне. Настаўнік паведамляе, што легенды і паданні вучні яшчэ будуць чытаць на ўроках літаратурнага чытання. Вучні расказваюць, якія творы яны любяць чытаць.

Тлумачэнне правапісу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі праводзіцца франтальна. *(Вершы, казкі, зямлю.)*

Запіс слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі, падзеленымі для пераносу, адбываецца на дошцы і кожным вучнем у сшытку. *(Апа-вя-да-нні, апа-вя-дан-ні, па-да-нні, па-дан-ні.)*

***Практыкаванне 28.***

Вучні чытаюць тэкст, тлумачаць значэнне выразу *даць лататы* (кідацца наўцёкі, імкліва ўцякаць); вызначаюць, да якой часткі тэксту зроблены малюнак, вусна пераказваюць тэкст па частках. Падрыхтоўку да пераказу можна арганізаваць у парах: вучні вызначаюць, хто якую частку будзе пераказваць, і расказваюць адзін аднаму.

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. *(Паляваннем, павуціння, павуціны, прыліпплі, крыллем, сваё, бачылі, забаяўся.)* Затым кожны вучань самастойна спісвае першую частку тэксту, падзяляючы для пераносу словы з падоўжанымі зычнымі гукамі адным са спосабаў на выбар. Арганізуецца калектыўная праверка выкананага задання.

***Практыкаванне 29.***

Вучні вызначаюць, хто будзе «пілотам», а хто — «касманаўтам». Затым калектыўна абмяркоўваюць, якімі словамі трэба дапоўніць сказы («пілоты» — *варэнне, збожжа*; «касманаўты» — *восенню, насенне; чытання, апавяданне*), звяртаецца ўвага на правільнае вымаўленне ў словах падоўжаных зычных гукаў. Два «пілоты» і два «касманаўты» запісваюць па сказе на дошцы, астатнія вучні — у сшытках. Пасля выканання задання праводзіцца зверка з узорам на дошцы, выпраўляюцца памылкі.

***Самастойнае выкананне задання на картцы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем:

| |
|---|
| Прачытайце словы. Закрэсліце непатрэбныя літары ў дужках.<br><br>Восе(н/нн)ю, са(л/лл)іць, ці(ш/шш)ыня, падаро(ж/жж)а, кало(с/сс)е, прыдаро(ж/жж)ны, восе(н/нн)ь, со(л/лл)ю, заці(ш/шш)а, кала(с/сс)ы. |

Праверка задання ажыццяўляецца настаўнікам самастойна.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 24–25, практ. 30. Настаўнік тлумачыць, што словы з падоўжанымі зычнымі гукамі вучні могуць падзяліць для пераносу любым спосабам на выбар.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якія зычныя гукі могуць падаўжацца паміж галоснымі? Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Як можна падзяліць для пераносу словы з падоўжанымі зычнымі гукамі?

## Урок 49. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэты ўрока:*** фарміраваць навык правапісу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі, уменне правільна дзяліць для пераносу словы з падоўжанымі зычнымі; фарміраваць уменне пісаць пад дыктоўку; адпрацоўваць вымаўленчыя навыкі; развіваць фанематычны слых, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі *раздолле, жыллё, мышшу, суддзя, раздолье, жильё, мышью, судья*.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 30.***

Вучні чытаюць народныя прыкметы, тлумачаць правапіс выдзеленых слоў. У гэты час два вучні запісваюць на дошцы гэтыя словы, падзяляючы для пераносу. Абмяркоўваюцца варыянты падзелу слоў для пераносу.

— Якія гукі ў словах з народных прыкмет вы вымаўлялі падоўжана? Якія яшчэ зычныя гукі могуць вымаўляцца падоўжана паміж галоснымі? Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў?

**3. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік агучвае тэму і мэты ўрока.

**4. Этап замацавання.**

***Калектыўнае выкананне задання на дошцы.***

— Прачытайце словы. На якія дзве групы іх можна размеркаваць? (Словы, запісаныя па-беларуску (*раздолле, жыллё, мышшу, суддзя*) і па-руску (*раздолье, жильё, мышью, судья*).)

раздолье | судья | суддзя

раздолле | мышшу

жыллё | мышью | жильё

Вучні размяркоўваюць карткі са словамі на дзве групы, затым чытаюць іх парамі. Асаблівая ўвага звяртаецца на вымаўленне падоўжаных зычных гукаў у словах, запісаных на беларускай мове.

***Практыкаванне 31.***

Вучні чытаюць словы па ланцужку, вызначаюць гук, які вымаўлялі на месцы пропуску, і тлумачаць, якімі літарамі яго трэба перадаць на пісьме. Затым кожны вучань самастойна запісвае словы ў сшытак. *(Дзень нараджэння, прывітанне, памяшканне, пытанне, захапленне, развітанне.)*

Пасля выканання пісьмовага задання праводзіцца праца па развіцці звязнага вуснага маўлення. Вучні расказваюць пра свой дзень нараджэння, выкарыстоўваючы словы з практыкавання. Калі ў каго-небудзь з вучняў сёння дзень нараджэння, можна прапанаваць аднакласнікам павіншаваць яго па-беларуску.

***Практыкаванне 32.***

Кожны вучань чытае тэкст самастойна. Калектыўна разбіраюцца словы з прапушчанымі літарамі: вучань вымаўляе слова, выдзяляючы голасам адпаведны гук, тлумачыць, якой літарай яго трэба абазначыць на пісьме. *(Наталля, пра збожжа, з заданнем, рашэнне, Таццяне, адніманне, складанне, Наталлі, за тлумачэнне.)*

Вучні запісваюць пад дыктоўку настаўніка першыя тры сказы, перад гэтым успамінаюць алгарытм запісу пад дыктоўку.

Пры наяўнасці часу настаўнік можа прапанаваць вучням скласці задачу, для рашэння якой трэба выканаць дзеянні, прыгаданыя ў тэксце.

***Практыкаванне 33.***

Выкананне практыкавання можа быць арганізавана наступным чынам. Спачатку вучні называюць словы «пілота», запісаныя ў другім слупку (*вулей, вуллі; праменне, прамень*); называюць, што адлюстравана на малюнках «касманаўта», якія прадстаўлены ў другім слупку (*колас, калоссе; корань, карэнне*). Вылучаюцца словы з падоўжанымі зычнымі гукамі.

Кожны вучань самастойна вызначае, спалучэнні слоў «пілота» ці «касманаўта» ён будзе запісваць. Два вучні выконваюць заданне з адваротнага боку дошкі. Затым арганізуецца праверка выкананага задання. *(Драўляныя вуллі, сонечнае праменне. Спелае калоссе, лекавае карэнне.)*

***Практыкаванне 34.***

Кожны вучань чытае тэкст самастойна. Настаўнік задае пытанне: «Што выклікала ў вас усмешку?» Затым тры вучні чытаюць тэкст па ролях. Праводзіцца праца над значэннем прыказкі. *(Не трэба пакідаць на заўтра тое, што можна зрабіць сёння. Кожную справу трэба рабіць своечасова.)* Вучні тлумачаць, ці правільна зразумеў сэнс прыказкі хлопчык, прыгадваюць жыццёвыя сітуацыя, калі яны маглі б ужыць гэту прыказку.

Франтальна праводзіцца праца па тлумачэнні правапісу слоў з прапушчанымі літарамі, вызначаюцца словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Кожны вучань самастойна запісвае іх, падзяляючы для пераносу адным са спосабаў на выбар. *(Пя-чэн-не (пя-чэ-нне), сне-дан-не (сне-да-нне), сён-ня (сё-ння).)*

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 27, практ. 35. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што запісаць трэба толькі першы сказ загадкі (у слупок, як у падручніку).

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў?

## Урок 50. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэты ўрока:*** фарміраваць навык правапісу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі, уменне правільна дзяліць для пераносу словы з падоўжанымі зычнымі; фарміраваць уменне пісаць пад дыктоўку, тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы; развіваць уменне вусна пераказваць тэкст; развіваць мысленне, арфаграфічную пільнасць; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** фотаздымкі, на якіх адлюстраваны казулі;

карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 35.***

Вучні чытаюць загадку, называюць адгадку, складзеную з літар. Настаўнік удакладняе ў вучняў, ці ведаюць яны, колькі гадзін складаюць суткі (24 гадзіны), якія іншыя адзінкі вымярэння часу яны ведаюць. Вучні вымаўляюць выдзеленыя словы і тлумачаць іх правапіс. *(Без сумнення, без вагання, адным.)*

Завяршаецца праверка дамашняга задання прыгадваннем правіла правапісу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі.

**3. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік паведамляе, што яны працягваюць вывучаць тэму «Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме». Вучні фармулююць мэты ўрока.

**4. Этап замацавання.**

***Практыкаванне 36.***

Выкананне заданняў праводзіцца калектыўна. Вучні разгадваюць рэбусы. Звяртаецца ўвага на правільнае вымаўленне слоў. Некалькі вучняў запісваюць словы на дошцы, падзяляючы іх для пераносу рознымі спосабамі (*на-ва-кол-ле, на-ва-ко-лле, на-ву-чан-не, на-ву-ча-нне, па-да-рож-жа, па-да-ро-жжа*), астатнія вучні — у сшытках, выбіраючы адзін са спосабаў на выбар.

***Практыкаванне 37.***

Кожны вучань самастойна чытае тэкст. Затым праводзіцца гутарка па пытаннях: «З якой мэтай вожык накіраваўся ў падарожжа? Чым харчуецца вожык?»

Праводзіцца франтальная праца па тлумачэнні правапісу слоў на ўжо вядомыя вучням правілы. Асаблівая ўвага звяртаецца на вымаўленне слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі. Арганізуецца запіс тэксту пад дыктоўку настаўніка. Вучні выконваюць узаемаправерку.

***Практыкаванне 38.***

Вучні чытаюць загадку, называюць адгадку. Настаўнік задае пытанні:

— Якія словы ў загадцы падказалі, што размова ідзе пра зайца? Якія іншыя жывёлы мяняюць сваё «адзенне» на зіму? Як вы думаеце, чаму так адбываецца ў прыродзе?

Настаўнік прапануе вымавіць словы *дыханне, здзіўленне, адзенне* і растлумачыць, якія літары трэба запісаць у словах. Кожны вучань запісвае словы ў сшытку, падзяляючы для пераносу любым спосабам на выбар. Затым праводзіцца калектыўная праверка выкананага задання. *(Ды-хан-не, ды-ха-нне, здзіў-лен-не, здзіў-ле-нне, адзен-не, адзе-нне.)*

***Практыкаванне 39.***

Пасля прачытання тэксту настаўнік задае пытанне: «Чаму дзяўчынка была ў захапленні?»

— Разгледзьце малюнак, раскажыце, як выглядае казуля. (Дадаткова настаўнік можа прынесці і паказаць фотаздымкі. У казулі кароткае тулава, тонкія і доўгія ногі. Поўсць густая, зімой буравата-шэрая, летам рыжая (у маладых казуль — плямістая). Дадаткова настаўнік можа расказаць, што на галаве ў самцоў ёсць маленькія рогі. Штогод у кастрычніку-снежні яны адпадаюць, да вясны вырастаюць новыя. Хвост у казулі кароткі, схаваны ў поўсць. Каля хваста ў жывёлы ёсць светлая пляма.)

— Ці бачылі вы калі-небудзь дзікіх жывёл у прыродзе? Якіх?

Вучні самастойна перачытваюць тэкст і выбіраюць, да якой часткі зроблены малюнак, вызначаюць назву, якая адпавядае ёй. *(Да першай часткі, «Незвычайная сустрэча».)*

Арганізуецца работа ў парах: вучні пераказваюць адзін аднаму тэкст па частках. Затым два вучні пераказваюць тэкст услых для ўсяго класа.

Тлумачэнне правапісу слоў праводзіцца франтальна. Узор тлумачэння вучня: «Вымаўляю слова — [й’эз’дз’іла]. Гук [дз’] на пісьме абазначаю літарамі ***дз***».

Кожны вучань самастойна запісвае словы з падоўжанымі зычнымі гукамі, падзяляючы іх для пераносу адным з магчымых спосабаў.

***Самастойнае выкананне задання на картцы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем:

> Прачытайце словы. Устаўце прапушчаныя літары.
>
> Стаго..е, тэлебача..е, пра..да, кры..е, паўтарэ..е, жа..-ранак, сн..гір.
>
> Якія правілы трэба ўспомніць, каб правільна запісаць прапушчаныя літары ў словах? Адзначце [+].
>
> - [ ] Правіла правапісу ***ў***.
> - [ ] Правіла правапісу ***е***, ***ё*** — ***я***.
> - [ ] Правіла правапісу ***о***, ***э*** — ***а***.
> - [ ] Правіла правапісу слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі.
> - [ ] Правіла правапісу вялікай літары.

Праверка задання ажыццяўляецца настаўнікам самастойна.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 30, практ. 40. Вучні дапаўняюць прыказкі патрэбнымі словамі. Настаўнік тлумачыць, што кожную прыказку трэба запісаць з новага радка.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Пералічыце зычныя гукі, якія могуць вымаўляцца падоўжана паміж галоснымі. Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў? Якімі літарамі трэба абазначыць падоўжаны гук [дз’]?

## Урок 51. Навучальны пісьмовы падрабязны пераказ апавядальнага тэксту*

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне пераказваць апавядальны тэкст па пытаннях і правільна афармляць яго на пісьме; развіваць звязнае вуснае і пісьмовае маўленне, памяць, мысленне; выхоўваць беражлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** карткі з тэкстам для кожнага вучня.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік паведамляе вучням пра новы для іх від работы: падрабязны пісьмовы пераказ тэксту.

— На якіх занятках вы ўжо рабілі пераказ, толькі вусны? *(На занятках беларускай і рускай мовы, літаратурнага чытання на рускай і беларускай мовах.)* Будзем вучыцца пераказваць тэкст пісьмова. Як вы думаеце, чым падобныя і чым адрозніваюцца вусны і пісьмовы пераказ?

— Адгадайце загадку і вызначыце, пра каго пойдзе гаворка ў тэксце пераказу:

Ранкам ля ракі сядзіць
і на паплавок глядзіць.
Мо, пашле яму рака
печкура на чарвяка?

*У. Мацвеенка* [1]

**3. Этап работы з тэкстам пераказу.**

***Тлумачэнне незразумелых слоў.***

— Падумайце і скажыце, што, на вашу думку, можа абазначаць слова *ледзякі*. Ад якога знаёмага вам слова яно ўтварылася?

***Чытанне тэксту настаўнікам.***

— Паслухайце тэкст (вучні сочаць па тэксце за чытаннем настаўніка) і скажыце, ці ўдалай была рыбалка.

**Жывіце, акунькі**

Сёння вялікі мароз. Любачка сядзіць каля акна. Яна чакае дзядулю з рыбалкі. Нарэшце дзядуля прынёс мяшочак акунькоў. Узяла Любачка адну рыбку, другую. Ледзякі, дый годзе! Раптам заскакалі акунькі. Ажылі. Шкада іх стала Любачцы. Вырашылі яны з дзядулем выпусціць акунькоў назад у рэчку. *(44 словы)*

*Паводле Фамы Рамашкі* [2]

***Гутарка з мэтай вызначэння ступені разумення вучнямі тэксту.***

Меркаванні вучняў па зададзеным пытанні. Гутарка па пытаннях настаўніка:

— Пра якую падзею гаворыцца ў тэксце? З чаго яна пачалася? Як працягвалася? Чым скончылася?

Пры абмеркаванні тэксту звяртаецца ўвага на тое, што адбылося з акунькамі ў цёплым памяшканні. Вучні павінны зразумець, што рыба, якую злавіў дзядуля, на марозе замерзла і стала як кавалак лёду, а потым адтаяла.

— Чаму Любачка сядзела дома? Якімі ўбачыла Любачка рыбак? Якія пачуцці ўзніклі ў Любачкі? Як можна ахарактарызаваць Любачку і дзядулю?

* Навучальны пісьмовы пераказ выконваецца ў сшытках для навучальных работ.

***Праца над моўнымі сродкамі тэксту.***

Тлумачэнне незразумелых вучням слоў арганізуецца ў выглядзе калектыўнай працы. Адзін вучань запытваецца пра слова, настаўнік дае яго ў мінімальным кантэксце (словазлучэнне, частка сказа або сказ). Вучні выказваюць меркаванне пра значэнне слова, тлумачаць яго.

Патрабуе ўдакладнення значэнне слоў *чакае, нарэшце, раптам, шкада* (*рус. жаль*), *вырашылі* (*прынялі рашэнне*), выраз *дый годзе!* (*рус. да и только!*), *ледзякі* (*кавалкі лёду*). Звяртаецца ўвага вучняў на склонавыя формы (*каму?*) *Любачцы*, (*з кім?*) *з дзядулем*.

***Вусны пераказ тэксту.***

Вусны пераказ тэксту вучнямі можа быць арганізаваны па групах, у парах, франтальна ў залежнасці ад падрыхтаванасці вучняў класа.

Чытанне тэксту вучнямі па адным сказе. Пастаноўка настаўнікам пытанняў да кожнага сказа ў тэксце. Пытанні з апорнымі словамі для адказу запісаны на дошцы. Выдзяленне ў кожным сказе слова, з якога можна пачаць адказ.

1. Які **сёння** мароз? *(Вялікі.)*
2. Дзе сядзіць **Любачка**? *(Каля акна.)*
3. Адкуль чакае **яна** дзядулю? *(З рыбалкі.)*
4. Што прынёс **дзядуля**? *(Мяшочак акунькоў.)*
5. Якія былі **акунькі**? *(Ледзякі, заскакалі.)*
6. Якое пачуццё выклікалі **яны** ў Любачкі? *(Шкадаванне.)*
7. Што вырашылі зрабіць **Любачка з дзядулем**? *(Выпусціць у рэчку.)*

***Арфаграфічная работа.***

Неабходна звярнуць увагу на правапіс слоў *з рыбалкі, нарэшце, мяшочак, назад*.

***Напісанне пераказу.***

Вучні самастойна пішуць пераказ, абапіраючыся на пытанні і апорныя словы. Праверка напісанага тэксту вучнямі. Падчас праверкі тэкст чытаецца вучнямі двойчы. Спачатку прасочваецца правільнасць перадачы зместу тэксту. Другое прачытанне мае на мэце прасачыць правільнасць напісання слоў і пастаноўкі знакаў прыпынку.

**4. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Які від працы асвойвалі на занятках? Чым ён вам спадабаўся? Што ў ім падалося вам складаным?

## Урок 52. Раздзяляльны мяккі знак і апостраф

***Мэта ўрока:*** пазнаёміць з асаблівасцямі ўжывання раздзяляльнага мяккага знака і апострафа; фарміраваць уменне правільна вымаўляць і пісаць словы з раздзяляльным мяккім знакам і апострафам; развіваць уменне ажыццяўляць групоўку з апорай на схемы, уменне працаваць з арфаграфічным слоўнікам; развіваць фанематычны слых, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, малюнак ці фота новабудоўлі з выявамі самазвала і пад'ёмнага крана; літары разразной азбукі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Настаўнік прапануе вучням разгледзець замацаваныя на дошцы літары і скласці з іх словы. Ён правакуе: «Мабыць, выпадкова тут змешчаны лішнія літары».

**нпырвтаіне** (*прывітанне*)

**сняанден** (*сняданне*)

**ацабгце** (*багацце*)

**неханце** (*хаценне*)

**янрпенце** (*цярпенне*)

Вучні чытаюць складзеныя словы.

— Пра якое правіла яны нам напамінаюць? У чым асаблівасць пераносу такіх слоў? Расцягніце літары, каб было бачна, як іх можна падзяліць для пераносу.

***Практыкаванне 40.***

— Прыгадайце прыказкі з дамашняга практыкавання з гэтымі словамі.

Вучні прамаўляюць (ці чытаюць) прыказкі, тлумачаць іх сэнс. Настаўнік прапануе зрабіць узаемаправерку пісьмовага дамашняга задання.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 41.***

У працэсе выканання практыкавання вучні павінны пачуць пры вымаўленні слоў прысутнасць гука [й'], таму словы вымаўляюцца парамі (*семя — сям'я, Валера — вальера*). Адрозненні ў вымаўленні слоў вызначаюцца з дапамогай схем. Вучні тлумачаць, якая схема адпавядае кожнаму слову, называюць гукі, якімі адрозніваюцца пары схем. Словы, у якіх паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й'], вучні запісваюць з каменціраваннем: «Пішу слова *сям'я*, пішу першы склад *ся* з літарай ***я*** ў першым складзе перад націскам, пішу другі склад *м'я* пасля ***м*** стаўлю апостраф, гукі [й'а] абазначаю літарай ***я***. Падкрэсліваю літары ***м*** і ***я***, паміж якімі ставіцца апостраф». Слова *вальера* тлумачыцца аналагічна.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік запытваецца ў вучняў, што яны будуць вывучаць на ўроку. Абагульняючы адказы вучняў, паведамляе, што будуць назіраць, як перадаюцца на пісьме гукі [й'а], [й'у], [й'э], [й'о], [й'і] літарамі ***я***, ***ю***, ***е***, ***ё***, ***і*** з дапамогай мяккага знака і апострафа. Вучні па прапанове настаўніка прыгадваюць, што мяккі знак гука не абазначае, гэта літара. Апостраф — гэта знак у выглядзе коскі на верхняй лініі радка.

***Чытанне і абмеркаванне інфармацыі рубрыкі «Увага».***

Вучні чытаюць інфармацыю. Пераказваюць яе ў парах. Франтальна арганізуецца гука-літарны аналіз слоў-прыкладаў з правіла. Ён праводзіцца для таго, каб вучні пачулі ў гучанні слова гук [й'] з наступным галосным і ўбачылі ў запісаных словах, як выкарыстоўваецца ***ь*** і апостраф для перадачы іх гучання. Мэтазгодна выкарыстаць класічны метадычны прыём чытання слова з раздзяляльным знакам і без яго.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 42.***

На матэрыяле практыкавання працягваецца папярэдняя работа. Спачатку вучні чытаюць словазлучэнні. Выразна вымаўляюць словы, запісаныя ў транскрыпцыі, устанаўліваюць іх значэнне і вызначаюць наяўнасць гука [й']. Работа з арфаграфічным слоўнікам мае на мэце вызначыць, які з раздзяляльных знакаў пішацца ў слове: ***ь*** ці апостраф. Спалучэнні, у якіх ёсць словы з раздзяляльным мяккім знакам і апострафам, запісваюцца на дошцы і ў сшытках з каменціраваннем і падкрэсліваннем.

***Практыкаванне 43.***

На матэрыяле практыкавання вучні назіраюць адрозненні ў запісе слоў з гукам [й'], які абазначаецца літарай ***й***, і словы з гукам [й'] з наступным галосным, які на пісьме передае гукі [й'а], [й'у], [й'э], [й'о], [й'і] літарамі ***я***, ***ю***, ***е***, ***ё***, ***і*** з дапамогай мяккага знака і апострафа.

У адпаведнасці з заданнем вучні складаюць словы са складоў і літар. Мэтазгодна франтальна праверыць, якія словы атрымаліся. Запіс слоў па трох слупках вучні робяць самастойна ў сшытках і з адваротнага боку на дошцы. Праверка выкананага на дошцы задання ажыццяўляецца перакрыжавана: словы «пілотаў» правяраюць «касманаўты» і наадварот.

На прыкладзе запісаных у слупках слоў настаўнік арганізуе назіранне за выпадкамі ўжывання літар ***й***, ***ь*** і апострафа для перадачы гука [й'] на пісьме. Увага вучняў засяроджваецца на дыферэнцыяцыі гука [й'] для абазначэння адпаведнай літары і выпадкі, калі гэты гук з наступным галосным перадаецца адной літарай і патрабуе ўжывання аднаго з раздзяляльных знакаў. Другім момантам назірання становяцца пазіцыі, у якіх ужываецца або раздзяляльны мяккі знак (пасля мяккіх зычных), або апостраф (пасля цвёрдых зычных). Пры правядзенні работы па назіранні важна прасачыць выразнае правільнае вымаўленне слоў вучнямі.

***Практыкаванне 44.***

Пасля самастойнага азнаямлення вучняў з тэкстам настаўнік задае дадатковыя пытанні:

— Што раней было на месцы будоўлі? Якая тэхніка працуе на будоўлі? Што прывезлі самазвалы? На што спадзяюцца людзі? Ці бачылі вы новабудоўлі? Раскажыце, што вы ведаеце пра дом, у якім жывяце.

Апошнія пытанні з'яўляюцца абавязковымі і маюць на мэце нефармальнае развіццё маўлення вучняў на цікавую тэму па малюнку ці фота новабудоўлі з выявамі самазвала і пад'ёмнага крана.

Пасля гутаркі арганізуецца выкананне моўнага задання. Спачатку вучні павінны знайсці ўсе словы з гукам [й'] (*ясені, елкі, рознае, звяр'ё, з'явіўся, аб'ект, пад'ёмны, пад'ехалі, вялікія, кар'ер, пад'езд, сям'я, атрымае, ў ім, маленькая, Мар'янка, пакоі*). Пасля вымаўлення кожнага слова вучні вызначаюць месца гука [й'] і спосаб яго перадачы. Пасля гэтай працы вучні самастойна з каменціраваннем выпісваюць словы з апострафам. Падкрэсліваюць суседнія літары, якія абазначаюць цвёрды зычны гук і гук [й'] з галосным гукам.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 33, практ. 45. Прачытайце загадку. З дапамогай малюнкаў назавіце адгадкі.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— «Работу» якога гука назіралі на ўроку? Якім чынам ён можа перадавацца на пісьме? Якая літара і знак дапамагаюць запісаць словы з гукам [й']?

## Урок 53. Раздзяляльны мяккі знак і апостраф

***Мэта ўрока:*** пазнаёміць з правілам правапісу раздзяляльнага мяккага знака і апострафа; фарміраваць уменне правільна вымаўляць і пісаць словы з раздзяляльным мяккім знакам і апострафам; вызначаць правільнасць напісання слоў з раздзяляльнымі знакамі з апорай на схему, тлумачыць правапіс слоў з раздзяляльнымі знакамі; выпрацоўваць уменне пісаць пад дыктоўку; развіваць фанематычны слых, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць паважлівыя адносіны да людзей розных прафесій.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, наборнае палатно з літарамі і фішкамі гукаў.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 45.***

Чытанне загадкі, называнне і тлумачэнне адгадак. Пры тлумачэнні адгадак трэба засяродзіць увагу на ўзаемасувязі зямлі, вады і раслін (травы). Словы з трыма гукамі вымаўляюцца вучнямі, робіцца іх гукалітарны аналіз. На наборным палатне выстаўляюцца літарныя і гукавыя (фішкамі) запісы гэтых слоў. Увага звяртаецца на ўжыванне раздзяляльнага мяккага знака і апострафа, вызначаецца, як перадаецца з іх дапамогай гучанне слова пры запісе.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Спачатку настаўнік запытваецца ў вучняў, ці дапамагалі яны бабулям на агародзе, якую працу выконвалі. Перад чытаннем праблемнай сітуацыі настаўнік папярэджвае, каб вучні былі ўважлівыя, сачылі па тэксце, таму што ў ім трэба будзе прагледзець запіс Чамучыка. Пасля чытання праблемнай сітуацыі настаўнік пытаецца, як Чамучык дапамагаў бабулі. Дае заданне яшчэ раз перачытаць яго паведамленне маці.

— Якія словы ў яго запісе напісаны не словамі і значкамі? Як вы думаеце, чаму хлопчык так зрабіў? Давайце дапаможам Чамучыку зрабіць правільна запіс гэтых слоў. Якія ў вас будуць прапановы?

На дошцы вучні запісваюць любыя варыянты слоў *палью* і *сям'я*.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

— Якую праблему павінны вырашыць на ўроку?

Чытанне праблемнага пытання.

— Давайце папрацуем і праверым, які запіс слоў будзе правільны.

***Практыкаванне 46.***

Вучні называюць прадметы, адлюстраваныя на малюнках. Адказваюць на пытанне з практыкавання. Пасля аналізу схем слоў запісваюць словы па групах: з раздзяляльным мяккім знакам, з апострафам. Пры падкрэсліванні літар тлумачаць, паміж якімі літарамі яны пішуцца.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Чытанне правіла настаўнікам па частках. Вучні адказваюць на пытанні:

— Пасля якіх літар зычных гукаў пішацца раздзяляльны ***ь***? Перад якімі літарамі? Які знак пішацца пасля іншых літар, калі чуецца гук [й']?

Самастойнае перачытванне правіла вучнямі ў парах адзін аднаму з тлумачэннем.

***Практыкаванне 47.***

Чытанне схемы арганізуецца па пунктах. Пасля чытання ідзе абмеркаванне кожнага пункта:

1. У якім выпадку трэба прымяняць алгарытм?

2а. Што трэба вымавіць на месцы пытальніка? Пры якой умове пішацца раздзяляльны ***ь***?

2б. Што трэба вымавіць на месцы пытальніка? Пры якой умове пішацца апостраф?

Наступнае заданне па прымяненні алгарытму выбару напісання раздзяляльнага ***ь*** ці апострафа павінна праводзіцца з падрабязным тлумачэннем каля дошкі і ў

сшытках. Значэнне слова *кастаньеты* ўстанаўліваецца па тлумачальным слоўніку ў канцы дапаможніка.

***Чытанне і абмеркаванне інфармацыі рубрыкі «Увага».***

Настаўнік прапануе вучням прачытаць інфармацыю з рубрыкі і сказаць, пра што новае яна паведамляе. Вучні хорам называюць словы, у якіх апостраф пішацца пасля літар ***з*** і ***н***.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 48.***

Рэкамендуецца, каб першы раз верш прачытаў настаўнік. Пры гэтым вучні паказваюць на малюнку, як ехаў герой верша. Потым вучні чытаюць верш самастойна і выконваюць другое заданне практыкавання.

Са словамі практыкавання, у якіх прапушчаны літары, праводзіцца работа, аналагічная папярэдняму практыкаванню. Для каменціравання выкарыстоўваецца алгарытм дзеянняў з практыкавання 47. Пасля запісу слоў вучні яшчэ раз чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Увага» і прыводзяць прыклады слоў з практыкавання.

***Практыкаванне 49 (самастойная работа).***

Настаўнік прапануе вучням самастойна прачытаць тэкст і сказаць, пра людзей якой прафесіі ў ім гаворыцца. Пасля гэтага вучні адказваюць на пытанні практыкавання перад тэкстам. Можна прапанаваць задаць пытанні па змесце тэксту самім вучням.

Вучні чытаюць тэкст па адным сказе і вызначаюць прапушчаныя літары. Тут вучні сутыкаюцца з выпадкам, калі мяккі знак абазначае мяккасць папярэдняга зычнага гука. Гэты матэрыял вывучаўся раней. Таму такія словы вучні тлумачаць самастойна: «Пішу мяккі знак, каб абазначыць мяккасць зычнага гука...» Словы, у якіх пішуцца раздзяляльныя знакі, падрабязна тлумачацца з апорай на алгарытм.

Пасля арфаграфічнай падрыхтоўкі выдзеленыя сказы запісваюцца пад дыктоўку з самаправеркай.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 37, практ. 50. Настаўнік чытае верш з дамашняга практыкавання. Тлумачыць незразумелыя словы. Вучні знаходзяць слова *куп'ё* ў тлумачальным слоўніку і чытаюць яго значэнне.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Давайце звернемся да праблемнага пытання і слоў, якія мы дапамагалі Чамучыку напісаць. Растлумачце, які запіс правільны. Як вы патлумачылі б Чамучыку правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа?

## Урок 54. Раздзяляльны мяккі знак і апостраф

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне правільна вымаўляць і пісаць словы з раздзяляльнымі знакамі, тлумачыць правапіс слоў з раздзяляльнымі знакамі, вызначаць колькасць гукаў і літар у такіх словах; выпрацоўваць уменне адрозніваць словы з раздзяляльным мяккім знакам ад слоў, у якіх мяккі знак абазначае мяккасць зычнага; замацоўваць уменне размяшчаць словы ў алфавітным парадку; развіваць уменне ажыццяўляць групоўку па самастойна вызначанай прымеце; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; пазнаёміць са слоўнікавым словам *спектакль*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** фотаздымак сям'і зуброў, веер лічбаў, сігнальныя карткі, наборнае палатно з літарамі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Праверка дамашняга задання пачынаецца з гутаркі пра зуброў. Вучні разглядаюць фотаздымак, расказваюць, што яны ведаюць пра зуброў, дзе зубры водзяцца, чаму яны занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь?

***Практыкаванне 50.***

Пасля чытання верша вучні працуюць з матэрыялам апошняга форзаца «Мы ведаем!». Для выканання задання яны рыхтуюць веер лічбаў. Вучні па-аднаму называюць словы, тлумачаць устаўленую літару, называюць, на якое правіла гэта слова. Па спісе знаходзяць правіла і паказваюць адпаведную лічбу.

Настаўнік просіць назваць словы на правіла, якое зараз вывучаецца: *куп'ё, сям'я.* На аснове гэтых слоў вучні ўзнаўляюць правіла правапісу апострафа. Затым прыгадваюць правіла правапісу раздзяляльнага мяккага знака. На наборным палатне паступова афармляецца запіс:

| | | |
|---|---|---|
| Літара зычнага гука, акрамя ***л***, ***с***, ***н***, ***ц***, ***дз*** | **' (апостраф)** | ***е***, ***ё***, ***і***, ***ю***, ***я*** |

| | | |
|---|---|---|
| ***л***, ***з***, ***с***, ***н***, ***ц***, ***дз*** | ***ь*** | ***е***, ***ё***, ***і***, ***ю***, ***я*** |

Настаўнік раіць вучням прыгадаць, які яшчэ выпадак напісання апострафа не адлюстраваны на схеме. *(Пасля **з** і **н** у словах «з'есці», «раз'езд», «з'езд», «з'ехаць», «уз'ехаць», «ін'екцыя».)*

**3. Этап замацавання вывучанага.**

***Работа са слоўнікавым словам.***

Настаўнік прапануе знайсці на першым форзацы новае слоўнікавае слова і чытае з тлумачальнага слоўніка, што яно абазначае: пастаноўка, паказ п'есы ў тэатры. Калі вучні не здагадваюцца, настаўнік называе першую і апошнюю літары. Пасля таго як слова *спектакль* знойдзена, вучні чытаюць яго, гавораць, на што ў напісанні слова трэба звярнуць увагу. Вучні атрымліваюць па адной літары: ***с***, ***п***, ***і***, ***е***, ***к***, ***т***, ***а***, ***к***, ***а***, ***л***. Настаўнік дае заданне вучням стаць з карткамі літар у руках так, каб атрымалася новае слоўнікавае слова. Вучні канстатуюць наяўнасць лішніх літар, недахоп літары ***ь***. Настаўнік запытваецца ў вучняў, навошта ім мяккі знак для слова *спектакль*. Вучні тлумачаць, што з яго дапамогай трэба паказаць мяккасць зычнага гука [л'].

***Практыкаванне 51.***

Вучні чытаюць словы і вызначаюць, якая літара прапушчана. Пасля самастойнага аналізу слоў вучні выказваюць прапановы па падзеле слоў на дзве групы: з раздзяляльным і змякчальным мяккім знакам. Мяркуемыя слупкі слоў зверху пазначаюцца схемамі

[мяккі зычны] [ь]   [мяккі зычны] [ь] [й'] [галосны]

Словы запісваюцца ў два слупкі. У кожны слупок па прапанове вучняў запісваецца яшчэ па адным слове. Пасля падкрэслівання літар, паміж якімі стаіць ***ь***, вучні канстатуюць, у якім выпадку пішацца раздзяляльны мяккі знак, а ў якім — змякчальны.

***Чытанне і абмеркаванне інфармацыі рубрыкі «Увага».***

Вучні чытаюць інфармацыю і падзяляюцца на дзве каманды: каманда змякчальнага ***ь*** і каманда раздзяляльнага ***ь***. Кожная каманда павінна растлумачыць, якую функцыю выконвае мяккі знак і калі пішацца, дапоўніць інфармацыю сваімі прыкладамі.

***Практыкаванне 52.***

На аснове колеравага выдзялення вучні складаюць прыказкі, тлумачаць іх сэнс і запісваюць пад дыктоўку. Пасля запісу прыказак пад дыктоўку ажыццяўляецца франтальная праверка напісанага з каменціраваннем. Арфаграфічная задача — вызначыць, якая літара пішацца ў слове, растлумачыць яе правапіс. Вучні называюць словы з раздзяляльным ***ь*** і апострафам.

***Практыкаванне 53.***

Вучні разглядаюць ілюстрацыю.

— Што можна прыгатаваць з гэтага набору прадуктаў? Прачытайце назву. Ці правільна мы здагадаліся?

Вучні чытаюць сказы самастойна і гавораць, што па гэтым рэцэпце не прыгатуеш булён. Як выправіць рэцэпт? Вучні чытаюць сказы ў патрэбнай паслядоўнасці. Настаўнік дае заданне расказаць рэцэпт па малюнку ў падручніку ў парах.

Арфаграфічная работа са словамі практыкавання адбываецца франтальна. Вучні знаходзяць словы з прапушчанымі літарамі і тлумачаць іх.

Запіс сказаў вучням самастойна ў правільнай паслядоўнасці. Узаемаправерка напісанага ў парах. Вучні падкрэсліваюць змякчальны ***ь*** адной рыскай, а раздзяляльны — дзвюма.

***Практыкаванне 54.***

Настаўнік прапануе прачытаць і рашыць задачу. Адказ паказаць з дапамогай веера лічбаў, растлумачыць адказ.

— У якіх імёнах пішацца раздзяляльны ***ь***, а ў якіх — апостраф? З якім знакам пішацца слова *сям'я*?

Вучні чытаюць апошняе заданне практыкавання. Прапануюць і абгрунтоўваюць паслядоўнасць запісу імёнаў. Запіс слоў у алфавітным парадку вучні робяць самастойна. Перад запісам трэба паўтарыць правіла ўжывання вялікай літары з дапамогай інфармацыі апошняга форзаца.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 40, практ. 55. Настаўнік з вучнямі чытае і тлумачыць прыказкі.

— Якія прыказкі трэба спісаць?

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— У чым адрозненне змякчальнага і раздзяляльнага мяккіх знакаў? У якіх выпадках пішацца апостраф?

Урокі 55–57 гл. у электронным дадатку.

*Працяг будзе.*

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. *Мацвеенка, У.* Азбука ў загадках / У. Мацвеенка ; маст. афармленне А. І. Гармазы. — Мінск : Беларускі Дом друку, 1992. — 32 с.
2. *Рамашка, Ф.* Жывы барометр / Ф. Рамашка. — Мінск : Юнацтва, 1986. — 40 с.

***Муравьёва Г. Л.****, кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой естественно-научных дисциплин Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка;*
***Урбан М. А.****, доктор педагогических наук, доцент кафедры естественно-научных дисциплин Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка;*
***Гадзаова С. В.****, старший преподаватель кафедры естественно-научных и лингвистических дисциплин и методик их преподавания Гродненского государственного университета имени Янки Купалы*

# Математика. IV класс

## Методические рекомендации

*Продолжение. Начало см. № 7–11 за 2022 г.*

### Умножение и деление (67 ч)

*Форма выполнения каждого задания обозначена с помощью букв:* ***Д*** *— задание представлено на доске и выполняется фронтально;* ***П*** *— выполняется индивидуально учащимися на партах;* ***ДП*** *— выполняется на доске и на партах.*

**Уроки 66. Письменное умножение многозначного числа на однозначное число без перехода через разрядную единицу**

***Цели:***

- познакомить с письменным умножением многозначного числа на однозначное число без перехода через разрядную единицу;
- учить выполнять письменное умножение значений массы на однозначное число.

**Устные и практические упражнения.**

**Д 1.** Проводится фронтальный опрос.

— Представьте число 72 500 в виде суммы разрядных слагаемых.

— Представьте число 153 726 в виде суммы единиц первого и второго классов.

— Назовите число, в котором 3 сотни, 2 десятка и 6 единиц.

— Назовите число, в котором 4 сотни тысяч, 7 десятков тысяч и 8 единиц.

— Сколько единиц 3-го (5-го) разряда в числе 29 604?